**13 студзеня 2023 г. – 125 гадоў з дня нараджэння ПЯТРА ІВАНАВІЧА РАТАЙКІ (1898 – 1982), дзяржаўнага дзеяча БССР, удзельніка Кастрычніцкай рэвалюцыі, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войн**



Пётр Іванавіч Ратайка нарадзіўся 13 студзеня 1898 года ў в. Пескі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці) у сялянскай сям'і. У 1912 годзе скончыў тры класы мясцовай школы, потым працаваў разам з бацькамі на гаспадарцы.

У верасні 1915 года з набліжэннем германскіх войск сям'я Ратайкаў эвакуіравалася ў г. Арэнбург, там Пётр працаваў на Арэнбургска-Орскай чыгунцы.

У маі 1916 года васемнаццацігадовым юнаком трапіў на фронт Першай сусветнай вайны. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года ён з першых дзён са зброяй у руках у Чырвонай Арміі. У складзе 18-га стралковага палка служыў спачатку радавым, потым палітруком. Удзельнічаў у баях супраць войск генерала А. І. Дутава і адмірала А. В. Калчака.

У ліпені 1920 года ўступіў у РКП(б). Пасля дэмабілізацыі жыў і працаваў у Беларусі. З 1921 года працаваў старшынёй Заслаўскага і Самахвалавіцкага валасных выканкамаў. З 1926 года тры гады вучыўся ў Камуністычным універсітэце Беларусі ў Мінску. Пасля яго заканчэння працаваў старшынёй Чэрыкаўскага, потым Крычаўскага райвыканкамаў, намеснікам старшыні Магілёўскага аблвыканкама. Не палічыць, колькі разоў сцерагла яго смерць. З бандыцкіх абрэзаў цалялі ў яго пад Мінскам і Заслаўем, рука бандыта кінула гранату на лясной дарозе пад Чэрыкавым.

З гістарычнымі падзеямі ў жыцці беларускага народа, з уз'яднаннем Заходняй Беларусі з БССР, звязана накіраванне П. І. Ратайкі, як вопытнага работніка, у горад Гродна. У той час Гродна з'яўляўся адным з буйнейшых прамысловых цэнтраў Заходняй Беларусі, але гаспадарка горада знаходзілася ў занядбаным стане. 15 снежня 1939 года адбыліся выбары ў гарадскі Савет дэпутаў працоўных, 21 снежня прайшла яго першая сесія. П. І. Ратайка стаў першым старшынёй гарсавета. Шмат цяжкасцей давялося пераадольваць і шмат карысных спраў удалося зрабіць у горадзе першаму старшыні Гродзенскага гарадскога Савета

дэпутатаў працоўных за няпоўныя два гады савецкай улады (са снежня 1939-га па чэрвень 1941 года). Яшчэ большымі былі планы на 1941 год і наступныя гады, але перашкодзіла вайна.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Пётр Ратайка знаходзіўся ў дзеючай арміі. Ваяваў у складзе 3-й арміі на Бранскім фронце. За мужнасць у барацьбе з ворагам быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Восенню 1943 года з пачаткам вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў П. І. Ратайка быў адкліканы з арміі і накіраваны ў распараджэнне Савета Народных Камісараў (СНК) БССР, які часова знаходзіўся ў Гомелі. Працаваў намеснікам старшыні СНК БССР (1943-1944).

У 1944 годзе П. І. Ратайка прыехаў у толькі што вызвалены горад Гродна. 8 жніўня аднавіў сваю работу гарадскі Савет дэпутатаў працоўных. 20 верасня Гродна стаў цэнтрам Гродзенскай вобласці. Да 1948 года Пётр Іванавіч займаў пасаду старшыні Гродзенскага абласнога выканкама. У гэтыя гады шмат увагі і часу аддаваў аднаўленню разбуранай гаспадаркі горада і вобласці. Уся краіна дапамагала адбудоўваць адзін са старажытнейшых беларускіх гарадоў, сюды везлі метал, вугаль, прамысловае абсталяванне, будаўнічыя матэрыялы. Ужо ў 1947 годзе прамысловасць вобласці дасягнула даваеннага ўзроўню.

У наступныя гады Пётр Іванавіч працаваў у Мінску. На працягу некалькіх гадоў узначальваў Галоўнае ўпраўленне рыбнай прамысловасці пры Савеце Міністраў БССР (1948-1953). Заўсёды добрасумленна выконваў свае абавязкі, не любіў самазадаволенасці, абыякавасці. На першым плане ў яго была дзелавітасць, прынцыповасць і, самае галоўнае, – сумленнасць. У сталым узросце завочна закончыў Цэнтральны інстытут рыбнай прамысловасці ў Маскве (1958).

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР I, II, III скліканняў (1938-1955). Узнагароджаны шасцю ордэнамі (Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга і інш.), медалямі. Аўтар дакументальнай аповесці «На жыццёвых кручах» (1985), якая выдадзена пасля яго смерці. Апісаў родную вёску Пескі, бедны побыт аднасяльчан, свой шлях чырвонаармейца, барацьбу з бандытызмам у 1920-я гады, студэнцкія гады ў Мінску, першыя месяцы Вялікай Айчыннай…

6 снежня 1967 года Пётр Іванавіч Ратайка рашэннем выканаўчага камітэта Гродзенскага гарадскога Савета

дэпутатаў працоўных № 260 удастоены звання «Ганаровы грамадзянін горада Гродна». Пастановай ад 31 ліпеня 1968 года № 149 выканкама Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных і бюро Гродзенскага гаркама КПБ першы старшыня Гродзенскага гарсавета дэпутатаў працоўных (1939-1941), старшыня Гродзенскага аблвыканкама (1944-1948) Ратайка Пётр Іванавіч Ратайка занесены ў Кнігу Народнай славы горада Гродна.

П. І. Ратайка пасля цяжкай хваробы памёр у 1982 годзе.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2023 г. Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф І катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Ратайка, П. І.** На жыццёвых кручах : дакументальная аповесць / Пятро Ратайка ; [літ. запіс і пасляслоўе Вячаслава Дубінкі]. – Мінск : Юнацтва, 1985. – 239 с.

***Аб жыцці і дзейнасці***

**Ратайка Пётр Іванавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. – Т. 9. – С. 132.

**Ганаровыя** грамадзяне горада Гродна ў пасляваенны перыяд. **Ратайка Пётр Іванавіч** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 683. – (З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны).

**Госцеў, А. П.** [Ратайко Пётр Иванович] / А. П. Госцеў, В. В. Швед // Кронан. Летапіс горада на Немане (1116-1990 гг.) / А. П. Госцеў, В. В. Швед. - Гродна, 1993. – С. 203.

**Долготович, Б. Д.** Ротайко Петр Иванович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 204-205.

**Пасля** вызвалення Айчыны : [аднаўленне Гродна ў 1944–1950 гг.] // Памяць. Гродна : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 1999. - С. 503–506.

**Плешавеня, А. М**. Першы старшыня : [Гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў П. І. Ратайка] / А. М. Плешавеня // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 330-331. – (На крутым павароце гісторыі).

**Ратайко Пётр Иванович** // Гродно : энциклопедический справочник. - Минск, 1989. - С. 343.

**Ратайко Пётр Иванович** // Книга народной славы. 1917-1967 : 50 год [Октябрьской революции]. - Гродно, 1968. - [С. 16.] ; Место хран. : УК Гродненский государственный историко-археологический музей.

**Ганаровыя** грамадзяне-землякі іншых гарадоў. **Ратайка Пётр Іванавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – – 2-е выд., дап. Кобрын, 2020. – С. 91-93 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**125 гадоў з дня нараджэння П. І. Ратайкі (1898)** // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2020-2025 гг. / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. - С. 92-93.

**Курачук, С**. История кобринского края в лицах : [почетные граждане белорусских городов – уроженцы Кобринщины] / страницу подготовила Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2021. – 28 октября (№ 43). – С. 4 : фото.

**Курачук, С**. Достойным - почётное звание! / Светлана Курачук // Кобрин-информ. – 2018. – 6 декабря (№ 49). – С. 4.

Продолжением проекта Кобринской центральной районной библиотеки «Славутыя імёны маёй малой радзімы» стало издание биобиблиографического справочника «Імі ганарыцца Кобрыншчына» и создание полнотекстовой базы данных «Ганаровыя грамадзяне Кобрынскага краю».

Кобрынскі раён
Пескі
Ратайка Пётр Іванавіч
Удзельнікі Грамадзянскай вайны
Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны
Дзяржаўныя дзеячы